паказу, арганізаваць зручныя аўтастаянкі, пад'езды і падыходы да аб'ектаў экскурсій, стварыць спрыяльныя ўмовы для іх візуальнага ўспрымання. Неабходна распрацаваць канкрэтныя турыстычна-экскурсійныя маршруты з канцэнтрацыяй вакол іх аб'ектаў сферы аблугоўвання. Але для паспяховай эксплуатацыі новых экскурсійных аб'ектаў неабходна вырашыць шэраг канкрэтных праблем агульнага характару, якія ўзніклі ў цяперашні час у экскурсійным менеджменце. Пра гэта гаварылася ў красавіку 1999 г. у Пінску на семінары "Экскурсійны менеджмент і развіццё турыстычна-экскурсійных маршрутаў на сучасным этапе ў рэспубліцы".

Па-першае, адсутнічаюць метадычныя распрацоўкі экскурсій, якія ўключаюць новыя культурна-гістарычныя аб'екты. Па-другое, адчуваецца недахоп кваліфікаваных экскурсаводаў. Па-трэцяе, перасталі ўлічвацца ўзроставыя катэгорыі экскурсантаў. Не хапае сродкаў на рэкламу аглядных і пешаходных экскурсій у школах, а школьнікі з'яўляюцца галоўнымі суб'ектамі экскурсійнага абслугоўвання. Трэба сказаць і пра тое, што многія школы не праяўляюць вялікай зацікаўленасці ў заказе экскурсій.

Вельмі хочацца, каб падрастаючае пакаленне ўвайшло ў трэцяе тысячагоддзе ўзбагачанае ведамі аб культуры і гісторыі нашай Радзімы і яе сталіцы горада-героя Мінска.

Т.М.Лапцэвіч,
*аспірантка*

## РОЛЯ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ВЫРАШЭННІ ДЭМАГРАФІЧНЫХ ПРАБЛЕМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Канстатуючы наяўнасць у нашай краіне дэмаграфічнага крызісу, сучасныя айчынныя навукоўцы спрабуюць вырашыць гэтую праблему, прапанаваць шляхі выйсця з яе.

Вывучэннем дэмаграфічнага становішча ў цэлым і рэпрадукцыйнай функцыі сям'і ў прыватнасці займаецца дэмаграфія. Да апошняга часу гэтая навука традыцыйна амаль манапольна даследавала гэтую галіну. Часцей за ўсё даследаванні зводзіліся да фіксацыі статыстычных звестак. Рэпрадукцыйная сфера сям'і разглядалася дэмографамі як сістэма рэпрадукцыйна-дэмаграфічных паказчыкаў, якія змяняюцца. Рэпрадукцыйна-дэмаграфічныя паказчыкі цесна звязаныя з рэпрадукцыйнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

функцыяй жанчыны, а таксама робяць уплыў на канчатковыя вынікі ўзнаўлення насельніцтва. Да іх належаць: дзетнасць сям'і, мацярынская, перынатальная і дзіцячая смяротнасць, аборты, ускладненне цяжарнасці і родаў.

На думку аўтараў артыкула "Дэмаграфія сям'і — праблемы мадэлявання сямейнага цыкла жыцця", фармальная логіка многа і часам прыгожа апісвае, але амаль ніколі і нічога не тлумачыць (1, с. 97—98). Гэтая тэндэнцыя атрымала з боку навукоўцаў, у якіх метадалагічны эзатэрызм дэмаграфіі выклікае пратэст і якія імкнуцца не толькі апісаць, але і тлумачыць сутнасць дэмаграфічных з'яў, назву "квантафрэнія".

Я.Рубін у сваёй рабоце "Аб ацэнцы дэмаграфічнага патэнцыялу" адзначае, што навуковы падыход да ацэнкі дэмаграфічнага патэнцыялу ў Беларусі пакуль яшчэ не вызначыўся. Якімі бездакорнымі, з навуковага пункту гледжання, ні ўяўляліся б заключэнні аб заўтрашнім дні на аснове супастаўлення ўзроўняў нараджальнасці і смяротнасці, адзначае аўтар названага артыкула, яны (гэтыя заключэнні), самі па сабе дакладныя, адлюстроўваюць, тым не менш, толькі тое, што ўтварылася на паверхні з'яў, а глыбінныя іх вытокі застаюцца, як правіла, нераскрытымі (4, с.45).

У гэтым плане вялікая роля належыць супрацоўніцтву эканомікі, сацыялогіі, дэмаграфіі і асабліва філасофіі, культуралогіі і іншых навук, якія ў тым ці іншым аспекце вывучаюць сям'ю.

Некаторыя вучоныя-дэмографы, акрамя фіксацыі рэпрадукцыйна-дэмаграфічных паказчыкаў, робяць спробы растлумачыць карані дэмаграфічнага крызісу. Але, за рэдкім выключэннем, даследчыкі ў якасці прычын дэмаграфічнага крызісу называюць ці вынікі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, ці ўпадак эканомікі.

Выяўленне сапраўдных фактараў уздзеяння на рэпрадукцыйную сферу сям'і важна як само па сабе, так і для распрацоўкі дакладных сацыяльных праграм, якія накіраваны на вырашэнне гэтай праблемы. Калі ж разглядваць праграмы, якія рэальна існуюць, то трэба адзначыць, што яны заснаваны на прынцыпе меркантылізму, г. зн. такога ўяўлення аб матывацыйнай структуры сям'і, якое звязана з матэрыяльным фактарам. Аўтары і прыхільнікі гэтых праграм будуюць сваю канцэпцыю на прычынна-выніковай сувязі, што здаецца ім бясспрэчнай: чым больш грошай дзяржава дасць сям'і, тым больш дзяцей сям'я дасць дзяржаве (2, с. 86).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На практыцы гэты фактар павышэння нараджальнасці не дзейнічае. І, нават наадварот, краіны з павышаным узроўнем сацыяльнай абароны балансуюць на мяжы так званага нулявога росту народанасельніцтва, а чым менш развіта грамадства эканамічна, тым яно маладзейшае дэмаграфічна. У сувязі з гэтым аўтары артыкула "Дэмаграфічнае становішча ў Расіі: стан і перспектывы" адзначаюць, што некаторыя спецыялісты тлумачаць рэзкае падзенне нараджальнасці ў Расіі, Беларусі і іншых краінах як звязанае з пераходам ад узроўню прыросту насельніцтва, характэрнага для краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, да ўзроўню прыросту эканамічна развітых краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі, г. зн. сучаснае дэмаграфічнае становішча трактуецца імі не як крызіснае, а як аптымальнае, натуральнае ў сваім пераходзе да лепшага жыцця.

Для аналізу залежнасці рэпрадукцыйнай функцыі сям'і ад эканамічных і сацыяльных фактараў разгледзім наступныя факты.

У 1983—1986 гг. у Беларусі быў заўважаны рост нараджальнасці. Адбылося гэта пасля прыняцця 31 сакавіка 1981г. пастанаўлення аб мерах па ўзмацненні дзяржаўнай дапамогі сем'ям, што выхоўваюць дзяцей (5, с. 66). На працягу года пасля рэалізацыі названых мер колькасць народжаных у краіне павялічылася амаль на 15 тыс. чалавек.

Напрошваецца вывад, што непасрэднай умовай хуткага росту нараджальнасці з'явілася ўздзеянне мер дэмаграфічнай палітыкі. Пад уплывам прынятых мер павялічылася інтэнсіўнасць нараджальнасці, г. зн. эканамічны фактар уплывае на працэс нараджальнасці. Але вышэйназваныя меры не справакавалі нараджэнне 3-га, 4-га, 5-га дзіцяці ў сям'і. Значыць, існуе нешта, якое ў большай ступені, чым эканамічны і сацыяльны фактары, уплывае на рэпрадукцыйную функцыю, або існуе нейкая прызма, праз якую эканамічныя і сацыяльныя фактары праламляюцца ў сваім уплыве на рэпрадукцыйную функцыю.

Звернемся да вынікаў анкетавання, праведзенага Л.П.Шахоцька (5, с. 91—92). Адзначаючы матывы нараджэння дзяцей у рэспандэнтаў, даследчык робіць вывад, што сярод указаных матываў больш за ўсё псіхалагічных, эмацыянальных, такіх як нараджэнне дзяцей

— дае адчуванне паўнацэннага жыцця (94,4 %);
— дае магчымасць праявіць любоў да дзяцей (77,8 %);
— умацоўвае шлюб (61,1 %);
— неабходна для здароўя жанчыны (61,1 %).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльныя і эканамічныя матывы адышлі на другі план. Найбольш распаўсюджанымі з'явіліся наступныя матывы:

— нараджэнне дзіцяці ў адказ на чаканне мужа і сваякоў (38,9 %);

— магчымасць пазбегнуць некаторых жыццёвых непрыемнасцей (29,4 %);

— маральны абавязак чалавека (47,1 %);

— гарантыя забяспечанай старасці (38,9 %).

Калі прааналізуем гэтыя вынікі, то ўбачым, што большасць матываў нараджэння дзіцяці з'яўляюцца прагматычнымі: умацаванне шлюбу, неабходнасць для здароўя жанчыны, нараджэнне дзіцяці ў адказ на чаканне мужа і сваякоў, магчымасць пазбегнуць некаторых жыццёвых непрыемнасцей, гарантыя забяспечанай старасці.

Матывы — магчымасць адчуць жыццё паўнацэнным і праявіць любоў да дзяцей, — з аднаго боку, прыстойныя, бо базіруюцца на панятці любові да дзіцяці. Але, з другога боку, у гэтых матывах выразна праглядаецца "эга" чалавека. Жаданне праявіць любоў да дзяцей з'яўляецца натуральным. Тое ж самае і з адчуваннем паўнацэннасці жыцця, бо маецца на ўвазе адчуванне свайго жыцця больш паўнацэнным і жыцця свайго мужа, жонкі, блізкага чалавека. Гэтыя матывы неабходна ўлічваць, калі вывучаецца дэмаграфічная сітуацыя ў рэспубліцы.

Значыць, у якасці матываў нараджэння дзіцяці, як і матываў пазбаўлення ад дзіцяці (аборт), з'яўляецца ўласнае Я.

Сучасная асоба надзвычай эгаістычная. "Звычайна гэтая асоба, — піша В.М.Розін, — уключае ў сваё Я сваю кватэру, любімую справу і г.д." (3, с. 80).

І таму мяркуемае дзіця, што па праву прэтэндуе на поўную жылплошчу, частку свабоднага часу бацькоў, іх пачуццяў і іншае, успрымаецца бацькамі як некаторае ўмяшанне ў паўнату іх адладжанага жыцця.

Можа здацца, што інакш быць не павінна. На самай жа справе можа і павінна ў тым выпадку, калі дзіця, нягледзячы ні на якія паказчыкі, успрымаецца як самакаштоўнасць, незалежна ад уласнага Я бацькоў. У гэтых адносінах цікавы адзіны матыў нараджэнне дзіцяці з'яўляецца маральным абавязкам чалавека (5). І тут мы бачым адлюстраванне ідэі пра самакаштоўнасць дзіцяці ў рэальным матыве бацькоў, але толькі ў тым выпадку, калі на пытанне: "Перад кім (чым) павінен быць выкананы гэты

маральны абавязак?" — даецца адказ: "Перад самім дзіцем". Бо можна яшчэ адказаць і: "Перад грамадствам", — маючы на ўвазе, што мы абавязаны ўзнавіць для грамадства грамадзяніна, працаўніка.

Такім чынам, адзначыўшы, што сацыяльныя і эканамічныя фактары ўплываюць на працэс нараджальнасці не прама, а апасродкавана, праз нешта, мы робім вывад, што гэтым нешта з'яўляецца сам чалавек як носьбіт нейкай унікальнай сістэмы каштоўнасцей, свядомасці, духоўнай культуры ў цэлым.

Усе гэтыя прыметы, што рэальна існуюць у кожным чалавеку, і прадстаўляюць сабой пэўную культурную асобасную прызму, праз якую праламляюцца сацыяльныя і эканамічныя праблемы. Ад якасці гэтай культурнай сутнасці, прыроды канкрэтнага чалавека і залежыць:

— або чалавек падсвядома ставіць сваю рэпрадукцыйнасць (менавіта рэпрадукцыйнасць як нейкую сваю якасць) у другое становішча ў адносінах да свайго ўласнага Я, і тады яму выгадна "апраўдвацца" эканамічнымі, сацыяльнымі непарадкамі ў грамадстве. Гэта лёгка вызначыць, калі мы дадзім чалавеку ўсё тое, адсутнасць чаго нібыта перашкаджае яму мець большую колькасць дзяцей, — кватэру, матэрыяльныя сродкі і інш., — але наўрад становішча сутнасна зменіцца; і гэта мы бачым на прыкладзе матэрыяльна забяспечаных сем'яў;

— або чалавек успрымае дзіця як першасную самакаштоўнасць, не плануе колькасць дзяцей, а ўспрымае паяўленне кожнага дзіцяці як нейкі дар, данасць, як гэта было ў традыцыйным тыпе сям'і. У такой сітуацыі любое эканамічнае і сацыяльнае становішча ўяўляецца другасным у адносінах да мяркуемага дзіцяці, і ніякія з вышэйуказаных фактараў не паўплываюць на рэпрадукцыйную сферу жыцця чалавека.


1. *Антонов А.И., Медков В.М., Нетрусов М.А.* Демография семьи — проблемы моделирования семейного цикла жизни // Вестн. Моск. ун-та. Сер.18: Социология и политология. — 1997. — №2. — С. 97—108.

2. *Бубнов Ю.М.* Новая стратегия повышения рождаемости// Междунар. науч.-практ. конф. "Философия социального действия и перспективы демографии", Минск, 6—7 апр. 1994 г. — Мн., 1994. — С. 85—87.

3. *Розин В.М.* Любовь и сексуальность в культуре, семье и взглядах на половое воспитание: Учеб. пособие для вузов. — М.: Логос; Высшая школа, 1999. — 208 с.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Рубин Я.* Об оценке демографического потенциала // Общество и экономика. – 1998. - №8-9. – С. 45–53.

5. *Шахотько Л.П.* Население Республики Беларусь в конце XX века. – Мн.: НИИ статистики при Минстате Республики Беларусь, 1996. – 253с.

**Т.И.Яковук,**
*соискатель*

## ПЛЮРАЛИЗАЦИЯ И ЛИБЕРАЛИЗАЦИЯ ЦЕННОСТНЫХ ПОЗИЦИЙ ВОЕННОСЛУЖАЩИХ ПОГРАНИЧНЫХ ВОЙСК РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ[1]

Базовые ценности белорусов, являющиеся предметом изучения, изменились под влиянием грандиозных сдвигов, произошедших в нашем обществе в течение последнего десятилетия XX в. Если неизменным осталось отношение к одобряемым и отрицаемым ценностям, то суждение "комфорт для себя и своей семьи" из категории отрицаемой стал одобряемой. Но в отличие от россиян, к 1993 г. изменившим свое отношение к категории "быть яркой индивидуальностью", принявших ее как одобряемую, лишь 26 % пограничников одобрили ее в 1998 г., отнеся к ценности среднего статуса. Суждение с ключевыми словами "жить, как все", как и у россиян, из одобряемого стало отрицаемым. Лишь 42 % опрошенных придерживаются этой позиции.

В число одобряемых попали суждения со словами *продолжение рода, уважение к традициям, хорошие отношения, забота о стариках, красота делает человека лучше, спокойная совесть, выразить себя.* Это вселяет надежду на то, что краха в системе ориентации современной белорусской молодежи не произошло. В числе отрицаемых ценностей, как и у россиян, располагаются суждения типа: *"власть, влияние", "смысл жизни не в потомках, а в улучшении собственной жизни", "а благополучие, свобода — второй вопрос", "можно посягнуть*

---

[1]Рассматриваемые нами ценностные ориентации военнослужащих даются в сравнении с показателями исследования "Динамика ценностей реформируемой России 1990—1993 гг.", проводившегося под руководством Н.И.Лапина (Социс. — 1996. — № 10. — С. 3—25).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ